Рэспубліканскі маладзёжны конкурс
«100 ідэй для Беларусі»

Праект
Музей “Страчаная спадчына свіслацкага краю”

Аўтары праекта:
Лысевіч Павел Уладзіміравіч, 9 клас
ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Корнадзьскі дзіцячы сад – базавая школа”
Іванюк Гражына Вітальеўна, 11 клас
ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзіцячы сад – сярэдняя школа”
Кіраўнікі праекта:
Лысевіч Вольга Аляксандраўна, настаўнік ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Корнадзьскі дзіцячы сад – базавая школа”
Урбановіч Зоя Аляксандраўна, настаўнік ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзіцячы сад – сярэдняя школа”

Свіслач 2018

Праект “Музей “Страчаная спадчына свіслацкага краю”

Гэты праект прысвечана тым паселішчам і храмам Свіслаччыны, якіх няма на сучаснай карце Свіслацкага раёна, але яны заўжды будуць у памяці яе жыхароў.

Прычыны ўзнікнення праекта

Свіслаччына – самабытны куточак Гродзеншчыны. Большая частка яе размешчана ў незвычайным месцы: на тэрыторыі нацыянальнага парка “Белавежская пушча”, што з’яўляецца своеасаблівым сімвалам, візітнай карткай нашай краіны, гордасцю беларускага народа. У цяперашні час, калі бурнымі тэмпамі развіваецца этнатурызм, экатурызм, наша малая радзіма здзіўляе наведвальнікаў не толькі прыгажосцю краявідаў, працавітасцю, гасціннасцю і шчырасцю яе жыхароў, чысцінёй, утульнасцю вёсачак, але нават трапнасцю, дакладнасцю, мілагучнасцю мясцовых назваў і архітэктурных збудаванняў, якія ўвасобілі ў сабе ўсю прыгажосць і непаўторнасць гэтага пушчанскага краю.

Уся зямля беларуская ўсыпана прыгожымі зоркамі-дыяментамі, старажытнымі помнікамі архітэктуры - гэта і Мірскі замак, і Нясвіжскі Радзівілаў, Навагрудская княжацкая рэзідэнцыя ў выглядзе крэпасці-ўмацавання, светлая Каложа над Нёманам і Траецкае прадмесце ў Мінску, таксама Жыровіцкі манастыр, Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку і многія іншыя. Помнікі гэтыя - мураваны летапіс, які лепш за любую машыну часу перанясе цябе ў мінулае, у далёкія часы нашых продкаў.

Архітэктура Беларусі - гэта летапіс народа ў дрэве і камені. Старажытныя замкі, ратушы, храмы з’яўляюцца адбіткам таленту народа. Архітэктурная спадчына Беларусі - невычарпальны калодзеж творчай фантазіі многіх пакаленняў, якія на працягу стагоддзяў стваралі непаўторны вобраз краіны.

Ці ведаеце вы, што некалі на тэрыторыі Беларусі існавала каля тысячы храмаў: замкаў, палацаў, касцёлаў, цэркваў, кляштараў? Калі згадзіцца з выказваннем, што архітэктура – гэта застылая музыка, дык наша краіна можа па праву лічыцца адной з самых музычных.

У даўніну, пяць або шэсць стагоддзяў назад, падарожнікі, якім выпадала ехаць праз Беларусь, амаль праз кожныя 10—15 кіламетраў бачылі магутныя сцены храмаў. Яны стаялі на варце дзяржаўнай бяспекі.

Гісторыя храмаў зведала розныя перыяды развіцця. Але ва ўсе часы яны паказвалі сілу, моц, дух дзяржавы. На жаль, бязлітасны ход гісторыі прывёў да таго, што ў іх адчыняліся калгасныя канторы, склады, свінакомплексы. Ад сівой мінуўшчыны засталіся скупыя рэшткі колішніх збудаванняў. Такі лёс аднаго з храмаў свіслацкай зямлі - касцёла Францысканцаў у вёсцы Грынявічы.

А некаторых не захавалася з прычыны ваенных падзей XIX-XX стагоддзя. Да ліку такіх на тэрыторыі Свіслацкага раёна адносіцца Свята-Ануфрыеўская царква ў аграгарадку Ціхаволя, царква Прысвятой Багародзіцы, грэка-каталіцкая царква Анёла-Ахоўніка і касцёл Святой Троіцы ў горадзе Свіслач, касцёл піяраў у вёсцы Ятвеск.

Але ёсць і шчаслівыя выключэнні. Гэта царква Святой Ганны ў вёсцы Задворані, Свята-Петра-Паўлаўская царква ў вёсцы Гарнастаевічы, Свята-Успенская царква ў аграгарадку Дабраволя. Дзверы гэтых храмаў былі адчынены ў канцы XX стагоддзя.

На сённяшні дзень шмат зроблена і робіцца ў Беларусі, каб аднавіць храмы моцы і прыгажосці. Прыйдзе дзень, калі загучаць галасы адноўленых збудаванняў для таго, каб кожны з нас мог з гонарам пахваліцца: “Мае продкі ўмелі будаваць такую прыгажосць, з якой мала што на зямлі можа параўнацца”.

Улічваючы той факт, што на тэрыторыі Свіслацкага раёна дзейнічае бязвізавы рэжым, дык прыгажосць нашай малой радзімы будзе даступна і жыхарам блізкага і далёкага замежжа, якія, карыстаючыся магчымасцю наведаць наш край, змогуць увачавідкі пераканацца ў тым, як мы шануем памяць аб тым, што было калісьці па розных прычынах страчана, а цяпер наколькі шануецца і захоўваецца нашчадкамі. Да прыкладу, магчыма, што ў некаторых замежных гасцей продкі пэўна час пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі або цяпер пражываюць блізкія родзічы.

На жаль, знікаюць у небыццё на Беларусі вялікія і малыя вёскі, а разам з імі іх незвычайныя назвы, за якімі хаваецца гісторыя нашага краю, нашай радзімы. Гледзячы на карту сселеных вёсак Свіслацкага раёна, разумееш, як многа ў нашай гісторыі страчана назаўсёды. Гэта не толькі назвы населеных паселішчаў, вёсак, хутароў, гэта і людзі, іх лёс. Усё менш застаецца тых, хто яшчэ памятае калі не зніклыя паселішчы, дык іх назвы. Мінулае паступова адыходзіць у нябыт… У наш час з дапамогай Інтэрнэту можна знайсці практычна любую інфармацыю. Але ні адзін Інтэрнэт не раскажа нам пра гісторыю сваёй малой радзімы.

Узнікае пытанне: а чым мы, моладзь, можам дапамагчы сваёй малой радзіме? Калі мы не можам ўратаваць знікаючую вёску ці хутар, узнавіць разбураны храм, то можам захаваць хаця б памяць аб іх для будучых пакаленняў. Калі не зрабіць гэтага зараз, то ўзнавіць у будучым будзе проста немагчыма.

Мэта праекта*:* стварыць музей пад адкрытым небам «Страчаная спадчына свіслацкага краю».

Задачы:

- прыцягнуць увагу адміністрацыі Свіслацкага раённага выканаўчага камітэта, кіраўнікоў прадпрыемстваў, старшынь сельскіх Саветаў, сродкаў

масавай інфармацыі да праблемы захавання памяці пра зніклыя назвы паселішчаў і храмы Свіслацкага раёна;

- сабраць і вывучыць разнастайныя крыніцы інфармацыі па дадзенай тэме;
- распрацаваць асабісты варыянт вырашэння праблемы: выканаць макет будучага музея;
- разлічыць смету праекта;
- правесці запланаваныя мерапрыемствы;
- прыняць удзел у адкрыцці музея пад адкрытым небам;
- правесці Фестываль зніклых айконімаў і храмаў Свіслаччыны.

Тып праекта: даследчы, доўгатэрміновы.

Удзельнікі праекта:

У праекце прымаюць удзел прадстаўнікі грамадскасці, навучэнцы школ Свіслацкага раёна, а таксама ўсе зацікаўленыя ў тым, каб унесці свой уклад у адкрыццё музея пад адкрытым небам “Страчаная спадчына свіслацкага краю”

Ініцыятары праекта: савет актывістаў ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Корнадзьскі дзіцячы сад – базавая школа” і ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзіцячы сад – сярэдняя школа”.

Кансультанты праекта: Лысевіч Вольга Аляксандраўна,настаўнік ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Корнадзьскі дзіцячы сад – базавая школа”, Урбановіч Зоя Аляксандраўна, настаўнік ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзіцячы сад – сярэдняя школа”.

Час рэалізацыі праекта:2019-2020 гг.

Партнёрамі праекта могуць стаць:

- сельскія Саветы Свіслацкага раёна;
- Свіслацкі раённы краязнаўчы музей;
- жыллёва-камунальная гаспадарка Свіслацкага раёна;
- дзяржаўныя ўстановы адукацыі Свіслацкага раёна;
- ДПУ НП “Белавежская пушча”

Што зроблена?

- Сабраны і сітэматызаваны зніклыя мясцовыя айконімы і храмы свіслацкай зямлі.
- Створаны макет музея пад адкрытым небам «Страчаная спадчына свіслацкага краю».

Апісанне праекта (на аснове макета)

Месца для будучага музея. Музей пад адкрытым небам «Страчаная спадчына свіслацкага краю» прапануецца адкрыць на тэрыторыі ранейшага хутара Войтаў Мост, які знаходзіцца ў Навасёлкаўскім лясніцтве ДПУ НП “Белавежская пушча”, дзе цяпер размешчана аднайменная гасцініца. Гэты былы хутар наведвае шмат турыстаў як блізкага, так і далёкага замежжа, іх увазе распрацаваны экскурсійныя маршруты, куды ўключаны і аб’екты нашага даследавання.

Выгляд будучага музея. На пляцоўцы, якая ўяўляе сабой геаграфічную карту Свіслацкага раёна, размешчаны аб’екты-прысвячэнні памяці зніклым хутарам і храмам, якія раней былі размешчаны на тэрыторыях сямі сельскіх Саветаў Свіслацкага раёна.

Макет 1



Макет 2



Аб’ект-прысвячэнне ўяўляе сабой камень, над якім узвышаецца страха (макет 1) або страха на слупах (макет 2). Камень сімвалізуе аснову сядзібы, а слуп і страха – роднае гняздо былых жыхароў.

Макет 1



Макет 2



На кожны камень прымацаваны стэнд, дзе змешчана карта пэўнага сельскага Савета, на якую нанесены назвы зніклых мясцовых айконімаў.

Зроблены макеты былых храмаў, што былі размешчаны некалі на тэрыторыях пэўных сельскіх Саветаў. Макеты выкананы паводле малюнкаў вядомых беларускіх мастакоў Напалеона Орды і Вітольда Карпызы, якія ў свой час навучаліся ў Свіслацкай настаўніцкай гімназіі і добра ведалі гісторыю свіслацкай зямлі.

Усе аб’екты- прысвячэнні злучаны паміж сабою сцяжынкамі.

Макет 1 **Макет 2**





На той частцы пляцоўкі, якая адпавядае тэрыторыі Белавежскай пушчы, змешчаны драўляныя скульптуры-выявы дзікіх жывёл, якіх часта можна сустрэць у дадзенай мясцовасці (макет 1).







Уся тэрыторыя пляцоўкі засаджана вечназялёнымі дрэвамі і кустамі.

Макет 1 **Макет 2**





Унікальнасць прапанаванага праекта заключаецца ў тым, што для яго рэалізацыі неабходны мінімальныя эканамічныя затраты, паколькі ўсе неабходныя матэрыялы ёсць на тэрыторыі Свіслацкага раёна.

Этапы рэалізацыі праекта

№ п/п	Найменаванне артыкула	Адказныя	Асабістыя сродкі	Сродкі з другіх крыніц (руб.)
1.	Наладжванне сувязей паміж партнёрамі	Ініцыятары праекта	**-**	**-**
2.	Работа з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі па зборы зніклых найменняў і храмаў	Ініцыятары праекта, навучэнцы школ раёна	**-**	**-**
3.	Падрыхтоўка пляцоўкі для музея	Прадстаўнікі Навасёлкаўскага лясніцтва ДПУ НП “Белавежская пушча”	**-**	**-**
4.	Збор камянёў для выканання аб’ектаў-прысвячэнняў і дастаўка іх на тэрыторыю музея	Прадстаўнікі сельскіх Саветаў	**-**	**-**
5.	Выраб стрэх і стэндаў для аб’ектаў, макетаў храмаў	Прадстаўнікі сельскіх Саветаў, ДПУ НП “Белавежская пушча”	**-**	2000 руб. (для набыцця матэрыялаў для стэндаў, стрэх і макетаў, фарбы, цвікоў, цэменту і інш.)
6.	Падрыхтоўка драўляных скульптур-выяў дзікіх жывёл	Прадстаўнікі сельскіх Саветаў, ДПУ НП “Белавежская пушча”	**-** (зварот да народных майстроў мясцовасці)	**-**
7.	Пасадка дрэў, кустоў	Прадстаўнікі Навасёлкаўскага лясніцтва, ДПУ НП “Белавежская пушча”, ініцыятары праекта	**-**	**-**

8.	Размяшчэнне музейных экспанатаў	Ініцыятары праекта, прадстаўнікі сельскіх Саветаў, ДПУ НП “Белавежская пушча”	-	-
9.	Адкрыццё музея. Фестываль зніклых мясцовых айконімаў і храмаў.	Ініцыятары праекта, прадстаўнікі ўлады, навучэнцы школ, прадстаўнікі сельскіх Саветаў, ДПУ НП “Белавежская пушча”	-	100 руб. (на матэрыял для вырабу сувеніраў)

Станоўчыя прадпасылкі праекта:

1. Маем вопыт па добраўпарадкаванні школьнага двара сіламі навучэнцаў.
2. Вядзенне паслядоўнай і мэтанакіраванай даследчай работы.
3. Вопыт супрацоўніцтва школьнікаў з кіраўніцтвам раёна пры вырашэнні разнастайных пытанняў.
4. Уменне рашэння фінансавых праблем з мінімальнымі затратамі.
5. Добрыя традыцыі аднавяскоўцаў: узаемадапамога, узаемавыручка, сяброўскія адносіны, падтрымка.

Плануемыя вынікі:

1. Сабрана і сістэматызавана інфармацыя пра зніклыя найменні паселішчаў і храмаў Свіслацкага раёна.
2. Актыўная частка моладзі, вучняў, настаўнікаў, прадстаўнікоў разнастайных служб аб’яднаны ў адну каманду.
3. Адна цікавая работа для ўсіх, і кожны знойдзе занятак для сябе.
4. Створана зона адпачынку.
5. Задзейнічаны спонсары.
6. Распаўсюджаны вопыт праз Інтэрнэт.
7. Падрыхтаваны матэрыял для экскурсіі на тэрыторыі будучага музея.

Дальнейшае развіццё праекта

Добраўпарадкаваная тэрыторыя будзе перыядычна аглядацца і падтрымлівацца ў чысціні і парадку. Будуць праводзіцца экскурсіі. Праект працягне работу ў рамках рэалізацыі рэспубліканскага інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі маральнага развіцця навучэнцаў у сучаснай адукацыйнай прасторы на праваслаўных традыцыях і каштоўнасцях беларускага народа з улікам рэгіянальнага сацыякультурнага кластара”.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Карпыза, В. Земля Волковысская/ Витольд Карпыза. – Лемборк, 2005. – 308 с.
2. Памяць. Свіслацкі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал. І.І.Варанец і інш.; Маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: Беларусь, 2004 г. - 526 с.
3. Рапановіч, Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Гродзенскай вобласці / Я. Н. Рапановіч. –Мінск: Навука і тэхніка, 1982.- 319 с.